П. М. Дзьякава прыйшло апавяшчэнне, паводле якога імператар настойваў на працягу інвентарнай рэформы [5, арк. 27–27 зв.].

Такім чынам, інвентарная рэформа для беларускіх сялян у эканамічным плане не прывяла да жадаемых вынікаў, не быў зменшаны падатковы ціск, але варта адзначыць, што з сацыяльна-прававога пункту гледжання гэтая рэформа афіцыйна ставіла рамкі памешчыцкай улады і стварала некаторую легальную аснову для абароны сялянамі сваіх інтарэсаў. Больш за тое, інвентарная рэформа прымусіла дваранства беларускіх губерняў задумацца аб адмене прыгоннага права і стала падставай таго, што працэс рэалізацыя сялянскай рэформы 1861 г. пачаўся менавіта з заходніх губерняў, землеўладальнікі якіх былі падрыхтаваны да адмены прыгоннага права, ў тым ліку, і за кошт праведзенай тут інвентарнай рэформы.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Жукович, П. И.* О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России. СПб., 1895.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 142. Воп. 1. Спр. 1772.
3. НГАБ. Ф. 142. Воп. 1. Спр. 1777.
4. НГАБ. Ф. 142. Воп. 1. Спр. 11267.
5. НГАБ. Ф. 142. Воп. 1. Спр. 18475.
6. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). Ф. 1266. Спр. 26.
7. РДГА. Ф. 1266. Спр. 34.
8. РДГА. Ф. 1266. Спр. 36.



УДК 351.742(438.14+476.6):329.14(=162.1)(476-89)(093.2)


# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЛЮБЛІНСКАГА І ГРОДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКІХ ЖАНДАРСКІХ УПРАЎЛЕННЯЎ ПА ПЫТАННЯХ ВЫШУКУ БЫЛЫХ БАЕВІКОЎ ППС-ФР У 1913 г. (НА ПРЫКЛАДЗЕ МЯСТЭЧКА РУЖАНЫ СЛОНІМСКАГА ПАВЕТА)


**Д. У. Лішай**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*



На аснове агентурных матэрыялаў з фонду 366 «Гродзенскае губернскае жандарскае ўпраўленне» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна разгледжаны асобны прыклад выкарыстання расійскімі ўладамі прэвентыўных мер у дачыненні да антыўрадавай дзейнасці польскіх палітычных партый у беларускіх губернях у 1913 г. Адлюстраваны аспект узаемадзеяння Люблінскага і Гродзенскага жандарскіх упраўленняў па пытаннях вышуку жыхара мястэчка Ружаны Слонімскага павета Я. Ю. Тамасяка, які з’яўляўся былым баевіком ППС-ФР. Адзначаецца імкненне афіцыйных улад прадухіліць патэнцыйную небяспеку з боку радыкальных элементаў у рэгіёне.

***Ключавыя словы:*** губернскія жандарскія ўпраўленні; агентурная запіска; ППС-ФР; мястэчка Ружаны; Слонімскі павет; прэвентыўныя меры.

# ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ЛЮБЛИНСКОГО И ГРОДНЕНСКОГО ГУБЕРНСКИХ ЖАНДАРМСКИХ УПРАВЛЕНИЙ ПО ВОПРОСАМ РОЗЫСКА БЫВШИХ БОЕВИКОВ ППС-ФР В 1913 г. (НА ПРИМЕРЕ МЕСТЕЧКА РУЖАНЫ СЛОНИМСКОГО УЕЗДА)

**Д. В. Лишай**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*

На основе агентурных материалов из фонда 366 «Гродненское губернское жандармское управление» Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно рассмотрен отдельный пример использования российскими властями превентивных мер в отношении антиправительственной деятельности польских политических партий в белорусских губерниях в 1913 г. Отражен аспект взаимодействия Люблинского и Гродненского губернских жандармских управлений по вопросу розыска жителя местечка Ружаны Слонимского уезда Я. Ю. Томасяка, который являлся бывшим боевиком ППС-ФР. Отмечается стремление официальных властей предотвратить потенциальную угрозу со стороны радикальных элементов в регионе.

***Ключевые слова:*** губернские жандармские управления; агентурная записка; ППС-ФР; местечко Ружаны; Слонимский уезд; превентивные меры.

# INTERACTION BETWEEN LUBLIN AND HRODNA PROVINCIAL GENDARMERIE ADMINISTRATIONS REGARDING THE SEARCH FOR FORMER MILITANTS OF THE PPS-FR IN 1913 (EXAMPLE OF THE TOWN OF RUZHANY, SLONIM DISTRICT)

**D. V. Lishai**

*Institute of History of the NAS of Belarus, 1, Akademicheskay Street, 220072, Minsk, Republic of Belarus, lishaiy-d96@yandex.ru*

Based on intelligence materials from the National Historical Archive of Belarus in Hrodna, fund 366, this article examines a separate example of the use of preventive measures by the Russian authorities against the anti-government activities of Polish political parties in the Belarusian provinces in 1913. The interaction between the Lublin and Grodno provincial gendarmerie administrations in searching for J. J. Tomasiak, a resident of the town of Ruzhany, Slonim district, who was a former PPS-FR militant, is described. It is noted that the authorities aimed to prevent potential dangers from radical groups in the area.

***Keywords:*** gendarmerie administrations; intelligence report; PPS-FR; town of Ruzhany; Slonim district; preventive measures.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Расійскай імперыі назіраліся значныя змены ў грамадска-палітычным жыцці. Разгортванне

нацыянальных рухаў, рэвалюцыйная сітуацыя, барацьба палітычных партый за ўплыў патрабавалі ад дзяржаўнай улады рашучых дзеянняў. Важнымі пытаннямі станавіліся выяўленне і своечасовая нейтралізацыя небяспечных палітычных элементаў. Гэтыя функцыі былі ўскладзены на спецыяльныя органы, падначаленыя Дэпартаменту паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў (далей – Дэпартамент паліцыі МУС): губернскія жандарскія ўпраўленні (далей – ГЖУ), ахоўныя аддзяленні (далей – АА), раённыя ахоўныя аддзяленні (далей – РАА) і інш. Яны ажыццяўлялі палітычны вышук і праводзілі дазнанне па палітычных справах. Менавіта ў сферу іх адказнасці ўваходзіў нагляд за членамі палітычных партый і нелегальных аб'яднанняў [5, с. 5–6; 6, с. 124].

У гэтай сувязі асаблівая ўвага расійскіх улад была звернута на Гродзенскую губерню. Спецыфіка рэгіёна вызначалася ў яго межаванні з Царствам Польскім. На тэрыторыі Гродзенскай губерні знаходзіліся актывісты палітычных партый, якія ўяўлялі значную небяспеку. Для прадухілення нелегальнай дзейнасці было задзейнічана Гродзенскае ГЖУ. Яно адносілася да трэцяга разраду ў сістэме органаў ЖУ, падначальвалася Дэпартаменту паліцыі МУС [3, с. 10; 6, с. 125]. У падпарадкаванні начальніка Гродзенскага ГЖУ меўся ад'ютант, 4 памочнікі, 4 вахмістры, 41 унтэр-афіцэр, 2 пісары, а таксама Асавецкая жандарская крэпасная каманда [3, с. 11–12].

Аднак нелегальная дзейнасць радыкальных элементаў не абмяжоўвалася межамі асобных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Гэта абумовіла неабходнасць наладжвання трывалых кантактаў паміж разнастайнымі органамі палітычнага вышуку. Таму парадак функцыянавання кожнага ведамства, узаемадзеянне са смежнымі структурамі рэгламентаваліся пастановамі, інструкцыямі, цыркулярамі [5, с. 5–11; 6, с. 124, 130–144]. Тыповым прыкладам дадзенай практыкі з'яўляцца супрацоўніцтва Люблінскага ГЖУ і Гродзенскага ГЖУ па пытаннях кантролю за баевікамі Польскай сацыялістычнай партыі – фракцыі рэвалюцыйнай (далей – ППС-ФР).

Тэму арганізацыі і дзейнасці органаў палітычнага вышуку ў Расійскай імперыі грунтоўна вывучала З. І. Перагудава. У яе манаграфіі змешчаны асобныя даныя, якія датычацца беларускіх губерняў [6]. У айчыннай гістарычнай навуцы праблемай функцыянавання органаў палітычнага вышуку займаўся С. І. Бусько. Артыкулы даследчыка адлюстроўваюць структуру і асаблівасці ГЖУ ў беларускіх губернях. У адной з публікацый апісваецца склад Гродзенскага ГЖУ, а таксама прыводзяцца прыклады барацьбы з нелегальнымі палітычнымі партыямі ў рэгіёне [2; 3].

Аднак заяўленая тэма мае характар лакальнага сюжэта. Прысутнасць ППС-ФР у беларускіх губернях у такім кантэксце яшчэ не была падрабязна адлюстравана ў працах даследчыкаў. Для раскрыцця праблемы неабходна звярнуцца да неапублікаваных крыніц. У першую чаргу гэта дакументы

катэгорыі «Асабліва каштоўныя» з фонду 366 «Гродзенскае губернскае жандарскае ўпраўленне» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). У іх захоўваецца інфармацыя пра дзейнасць членаў палітычных партый і антыўрадавых аб'яднанняў на тэрыторыі Гродзенскай губерні ў пачатку XX ст., а таксама асвятляецца праца органаў палітычнага вышуку. Непасрэдна да разглядаемай праблемы датычыцца справа № 439 [4]. У ёй змешчаны агентурныя запіскі і даведкі Люблінскага ГЖУ, перапіска з Гродзенскім ГЖУ.

22 сакавіка 1913 г. штучнік Люблінскага ГЖУ «Моргун» падрыхтаваў агентурную запіску пра ППС-ФР. У дакуменце значылася імя 29-ці гадовага мешчаніна г. Любартаў Люблінскай губерні рымска-каталіцкага веравызнання Яна Юзафа Тамасяка. Апошні пражываў у м. Ружаны Слонімскага павета Гродзенскай губерні. Ён валодаў дзвюма лаўкамі (малочных і харчовых прыпасаў), вырабляў тавары на продаж. Акрамя таго, у м. Ружаны пражывалі яго родзічы: сястра Анэля Тамасяк і швагер Адам Магерка. Апошні з'яўляўся кампаньёнам Я. Ю. Тамасяка ў гандлёвых справах [4, арк. 105].

Увага органаў палітычнага вышуку да асобы Я. Ю. Тамасяка тлумачыцца яго прыналежнасцю да катэгорыі баевікоў ППС-ФР. Ён асабіста браў удзел у шэрагу «эксаў». На рахунку Я. Ю. Тамасяка былі напады на казённыя вінныя лаўкі і гмінныя ўпраўленні на тэрыторыі Царства Польскага. Акрамя таго, расійскія ўлады падазравалі яго ў замаху на зборшчыка казённых вінных лавак Сцяпанава ў снежні 1906 г. Таксама Я. Ю. Тамасяка фігураваў у справе аб забойстве канвойнага салдата 71-га Бялёўскага пяхотнага палка. Затрыманы каля месца злачынства, Я. Ю. Тамасяк быў асуджаны да ссылкі ў Табольскую губерню тэрмінам на 2 гады. 5 лютага 1907 г. афіцыйныя ўлады накіравалі яго на месца адбыцця пакарання [4, арк. 105–105 адв.].

Аднак ужо ў верасні 1910 г. Я. Ю. Тамасяк чарговы раз трапіў у зводкі Люблінскага ГЖУ. У ваколіцах в. Ляшковіцэ Люшэўскай гміны Любартаўскага павета Люблінскай губерні паліцэйскімі вартаўнікамі была затрымана падазроная асоба. Ёю аказаўся 14-ці гадовы юнак Блажэй Кайзер. Пры аглядзе яго пінджаку супрацоўнікі паліцыі выявілі зараджаны рэвальвер сістэмы «Браўнінг» і пашпартную кніжку на імя селяніна Станіслава Антонава Цясельскага, выдадзеную 14 лютага 1905 г. за № 638. Пры далейшым разбіральніцтве высветлілася, што гэты дакумент быў скрадзены невядомымі асобамі яшчэ 9 сакавіка 1909 г. падчас абрабавання Сырнікскага гміннага ўпраўлення Любартаўскага павета Люблінскай губерні. Паводле паказанняў Б. Кайзера, усе рэчы з'яўляліся ўласнасцю яго майстра-каменшчыка Я. Ю. Тамасяка. Апошні, пабачыўшы набліжаючыхся паліцэйскіх вартаўнікоў, збег. Перад гэтым Я. Ю. Тамасяк пакінуў свае рэчы вучню Б. Кайзеру [4, арк. 105 адв.].

На працягу 1911 г. вышукам Я. Ю. Тамасяка актыўна займалася дапаможная агентура Люблінскага ГЖУ. Праз некаторы час атрымалася выявіць і адсочваць прыватную перапіску былога баевіка ППС-ФР. У выніку перлюстрацыі карэспандэнцыі стала вядома, што адрасатамі лістоў Я. Ю. Тамасяка з'яўляліся родныя, якія пражывалі ў г. Любартаў Люблінскай губерні. Знаходзячыся ў Седлецкай губерні, Я. Ю. Тамасяк падпісваў лісты псеўданімам «Сервус». Аднак, калі ён пераехаў у Віцебскую губерню, то выкарыстоўваў імя «Юзеф». Агентурным шляхам было ўстаноўлена, што падчас пражывання ў Сувалкаўскай губерні ў 1912 г. Я. Ю. Тамасяк дасылаў лісты сваім родным у г. Любартаў пад рознымі імёнамі: «Николай», «Юзеф», «Тадзик», «Николай Студзинский». У 1913 г. Я. Ю. Тамасяк дасылаў лісты пад імем «В. Родак» [4, арк. 105 адв. – 106].

Засноўваючыся на атрыманых даных ад штучніка «Моргуна», начальнік Люблінскага ГЖУ П. П. Осіпаў накіраваў ў адрас начальніка Гродзенскага ГЖУ М. І. Шамшова копію агентурнай запіскі ад 22 сакавіка 1913 г. Да яе дадавалася фатаграфічная картка Я. Ю. Тамасяка. Звярталася ўвага на неабходнасць тэрміновага вышуку і арышту былога баевіка ППС-ФР [4, арк. 105].

Відавочна, што прысутнасць на тэрыторыі Гродзенскай губерні радыкальнага актывіста польскай палітычнай партыі выклікала сярод прадстаўнікоў афіцыйных улад значную занепакоенасць. У 1913 г. м. Ружаны – цэнтр Ружанскай воласці Слонімскага павета Гродзенскай губерні, дзе пражывала 7 310 чалавек [1, с. 444, 451]. Знаходжанне ў мястэчку падрыхтаванага баевіка, на рахунку якога меліся ўзброеныя напады і падазрэнне ў забойстве прадстаўніка ўлады, маглі прывесці да негатыўных наступстваў.

Для ацэнкі патэнцыйнай небяспекі з боку асобы Я. Ю. Тамасяка варта звярнуцца да характарыстыкі самой ППС-ФР. Партыя афармілася пасля расколу ППС на IX з'ездзе ў 1906 г. У выніку ўзніклі ППС-Левіца і ППС-ФР. Адным з лідараў і ідэйных натхняльнікаў апошняй з'яўляўся Ю. Пілсудскі. Галоўнай мэтай ППС-ФР стала аднаўленне незалежнасці Польшчы праз антыўрадавае ўзброенае выступленне. Партыя прытрымлівалася радыкальнай тактыкі. У яе структуры мелася асобная сілавая адзінка – Баявая арганізацыя ППС-ФР Падрыхтаваныя баевікі выкарыстоўвалі тэрор у дачыненні да органаў дзяржаўнай улады, праводзілі «эксы» для атрымання фінансаў на партыйныя патрэбы [7, s. 112–123, 125–131].

Нягледзячы на тое, што ў архіўнай справе адсутнічаюць падрабязнасці абставін далейшага вышуку і затрымання Я. Ю. Тамасяка, відавочна, што ўзаемадзеянне Люблінскага і Гродзенскага ГЖУ па дадзеным пытанні было дастаткова эфектыўным. Ужо 21 красавіка 1913 г. у квітанцыі (№ 2636) начальнік Люблінскага ГЖУ П. П. Осіпаў інфармаваў начальніка Гро-

дзенскага ГЖУ М. І. Шамшова, што Я. Ю. Тамасяк быў арыштаваны і дастаўлены ў г. Люблін у суправаджэнні вахмістра Т. Влязлова і унтэрафіцэра Л. Болбата [4, арк. 112].

Такім чынам, ва ўмовах ускладнення грамадска-палітычнай сітуацыі ў Расійскай імперыі напярэдадні Першай сусветнай вайны органамі палітычнага вышуку Дэпартамента паліцыі МУС прымяняліся прэвентыўныя меры, накіраваныя на нейтралізацыю любых форм антыўрадавай дзейнасці ў беларускіх губернях. Асаблівая ўвага надавалася актыўнасці палітычных партый і аб'яднанняў. Узаемадзеянне Люблінскага ГЖУ і Гродзенскага ГЖУ па пытаннях вышуку і арышту былога баевіка ППС-ФР Я. Ю. Тамасяка ў 1913 г. з'яўляецца прыкладам прадухілення патэнцыйнай небяспекі з боку радыкальных элементаў у рэгіёне.

## Бібліяграфічны спіс


1. Адрес-календарь и справочная книжка Гродненской губернии на 1914 год / Гродн. губерн. стат. ком. Гродна : Губерн. тип., 1913.
2. *Бусько, С. І.* Асобны Корпус Жандараў і сістэма нагляду за палітычнымі партыямі ў беларускіх губернях у 1907–1914 гг. // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. Вып. 2 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. Минск: РИВШ, 2018. С. 60–63.
3. *Бусько, С. И.* Структура и кадровый состав губернских жандармских управлений на территории Беларуси (конец XIX – начало XX в.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2010. С. 9–18.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). Ф. 366. Воп. 1. Спр. 439.
5. «Охранка»: Воспоминания руководителей политического сыска / Вступ. статья, подгот. текста и коммент. З. И. Перегудовой. Т. 1. М. : Новое литературное обозрение, 2004.
6. *Перегудова, З. И.* Политический сыск России (1880–1917) / З. И. Перегудова. 2-е изд., перераб. и доп. М. : РОССПЭН, 2013.
7. *Tomicki, J.* Polska Partia Socjalistyczna, 1892–1948. Warszawa : Książka i Wiedza, 1983.


УДК 338.245.2(476)"1812"

# СУКОННАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ НАПЯРЭДАДНІ ВАЙНЫ 1812 г. І СПРОБЫ ЯЕ МАБІЛІЗАЦЫІ РАСІЙСКІМІ ЎЛАДАМІ

**А. М. Лукашэвіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, lukashevand@mail.ru*

У артыкуле аналізуецца стан суконнай прамысловасці беларускіх губерняў напярэдадні вайны 1812 г. і спроба расійскіх улад мабілізаваць яе магчымасці для патрэб расійскай арміі. Паказана, што з-за адсутнасці на тэрыторыі Беларусі прадпрыемстваў па вытворчасці зброі і боепрыпасаў урад сканцэнтраваў асноўную ўвагу на пашырэнні суконнай вытворчасці. Раскрываецца механізм стварэння на ільготных умовах мануфактур, якія павінны былі пастаўляць сукно для патрэб расійскага войска. Адзначаецца, што